# 7. СОВРЕМЕННАЯ ФИЛОЛОГИЯ: ЯЗЫК, РЕЧЬ, ТЕКСТ. МЕТОДИКА ПРЕПОДАВАНИЯ ФИЛОЛОГИЧЕСКИХ ДИСЦИПЛИН

## АСАБЛІВАСЦІ АЙКАНІМІІ РУДАБЕЛЬШЧЫНЫ

***Андрусевіч Н.Ф.*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Нувуковы кіраўнік –*** *В.В. Шур, д-р філал. навук, прафесар*

Тапанімія Рудабельшчыны спецыяльна не разглядалася беларускімі лінгвістамі, аднак асобныя звесткі пра паселішчы, назвы гэтай часткі Беларусі можна знайсці ў гісторыка-дакументальнай хроніцы “Памяць. Акцябрскі раён”, у працах *В. Жучкевіча, В. Лемцюговай, У. Юрэвіча, Я. Рапановіча, А. Станкевіч, Н. Багамольнікавай* і інш. Некаторыя айконімы, гідронімы, мікратапонімы гэтага рэгіёна атрымалі тэарэтычнае асэнсаванне і апісанне ў працах *А. Рогалева, В. Шура, У. Юрэвіча* і інш., у мастацкіх творах беларускіх пісьменнікаў *С. Грахоўскага, Ф. Янкоўскага, А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка, С. Шах* і інш.

Айконімы гэтага рэгіёна ў сваіх утваральных асновах захоўваюць багатую інфармацыю аб заснавальніках паселішчаў, аб прыродна-геаграфічных умовах жыцця тагачаснага насельніцтва, аб сувязі прыродна-



МГПУ им. И.П.Шамякина

геаграфічных аб'ектаў з практычнай дзейнасцю чалавека, аб характары мясцовых промыслаў, занятках жыхароў, тыпах пасяленняў і інш. Рэгіён уключае гарадскі пасёлак *Акцябрскі* і 78 самых розных паселішчаў – вёсак, былых засценкаў, хутароў і інш. З канца 30-ых гадоў XX ст. да нашых дзён перасталі існаваць у гэтым рэгіёне яшчэ 102 паселішчы.

Паводле лексіка-семантычнай характарыстыкі асноў айконімы гэтага рэгіёна падзяляюцца на: 1) айконімы адапелятыўнага паходжання *(Вуглы, Сасноўка, Параслішча* і інш.) – найбольш прадуктыўная група(66,7 %);

2) айконімы адантрапанімнага паходжання (*Андрэеўка, Майсееўка, Юркі* і інш.) – значна меншая група (25,6%); 3) айконімы адгідранімнага паходжання (*Пружынішчы, Чорныя Брады, Трэмля, Заазер'е*) – самая нешматлікая група (8,7%).

Паводле лексічнага складу ўтваральных асноў айконімы Рудабельшчыны, што аформіліся на базе апелятыўнай лексікі, можна падзяліць на некалькі семантычных груп: 1) айконімы, суадносныя з апелятывамі, матываваныя прыродна-геаграфічнымі асаблівасцямі, якія характарызуюць мясцовасць, яе флору (*Граб'ё, Сасноўка, Лескі, Параслішча, Новая Дуброва, Гарохавішчы*); 2) айконімы, у аснову якіх пакладзены апелятывы, што ўзыходзяць да найменняў зямельных участкаў (*Гаць, Воземля, Дзербін, Мошны, Подгаць, Ніўнае, Вуглы, Рог* і інш.); 3) айконімы, утваральныя асновы якіх указваюць на месца размяшчэння паселішча ў адносінах да якога-небудзь іншага аб'екта (*Забалацце, Залессе, Зарэчча, Заверхлессе, Зацішша, Падветка, Парэчча*). Значны пласт айканіміі рэгіёна − айконімы, якія знікаюць, архаізуюцца ў выніку самых розных сацыяльных працэсаў.



МГПУ им. И.П. Шамякина